**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**
**АДДЗЯЛЕННЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ**
**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ**

**Шаноўныя калегі!**
**Запрашаем Вас прыняць удзел**
**у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі**

# «АКТУАЛЬНЫЯ НАПРАМКІ ДАСЛЕДАВАННЯЎ СУЧАСНАЙ АНТРАПАЛОГІІ»

**Тэрміны правядзення канферэнцыі:** ***28 – 30 чэрвеня 2022 г.***
**Месца правядзення канферэнцыі:** Інстытут гісторыі НАН Беларусі

**Асноўныя накірункі работы канферэнцыі**
*1. Гістарычная антрапалогія: міждысцыплінарныя аспекты палеаантрапалогічных даследаванняў і пашырэнне магчымасцяў аналізу*
*2. Гістарычная памяць: жыццё і дзейнасць навукоўцаў, якія ўнеслі ўклад у развіццё антрапалагічнай навукі*
*3. Біялагічная і сацыякультурная антрапалогія: адаптацыйныя механізмы ва ўмовах дынамічнага інфармацыйнага асяроддзя*
*4. Сучасная спартыўная антрапалогія - дасягненні і перспектывы*

*У рамках канферэнцыі будзе праведзены круглы стол для маладых навукоўцаў "Сучасная антрапалогія". Жадаючыя прыняць удзел у дадзеным мерапрыемстве просім пазначыць гэта ў заяўцы.*

**Рэгламент:** выступленні на пленарным паседжанні – да 20 хвілін, на секцыйных паседжаннях – да 10 хвілін.

**Рабочыя мовы канферэнцыі:** руская, беларуская, англійская.

**Тэрмін падачы заявак у аргкамітэт:** ***да 15 мая 2022 г.*** У заяўцы на ўдзел у канферэнцыі паведамляецца назва даклада і звесткі пра аўтараў – імя, прозвішча, імя па-бацьку, навуковая ступень, званне, месца працы, пасада, кантактныя адрасы, тэлефоны, e-mail, інфармацыя пра неабходнасць забеспячэння мультымедыйнай тэхнікай.

**Матэрыялы канферэнцыі:** пасля праходжання рэцэнзавання могуць быць апублікаваны ў штогадовым зборніку навуковых артыкулаў «Актуальные вопросы антропологии».

Артыкул прадстаўляецца на рускай, беларускай, англійскай мовах у электронным варыянце (*.doc ці *.rtf) і ў двух экзэмплярах на паперы. Артыкул афармляць паводле наступных правілаў: аб’ём – не менш 14 тыс. друк. знакаў і не перавышаць 10 стар., шрыфт – Times New Roman, памер шрыфта – 14 (для рускага, беларускага ці англійскага рэзюмэ, ключавых слоў, назваў малюнкаў, табліц і саміх табліц – памер шрыфта – 12), інтэрвал – адзінарны. **Водступ** абзаца – 1 см. Палі: верхняе – 2, ніжняе – 2, левае – 2, правае – 2. Рэзюмэ аб’ёмам 250–300 слоў з падраздзеламі (Уводзіны з указаннем мэты даследавання, Матэрыялы і метады, Вынікі, Заключэнне) у пачатку тэкста – на рускай, (беларускай) мовах, у канцы тэкста – на англійскай. Ключавыя словы – пасля рэзюмэ. Структура тэкста ўключае наступныя падраздзелы: **Уводзіны, Матэрыялы і метады, Вынікі і іх абмеркаванне, Заключэнне, Літаратура**. Спіс літаратурных крыніц фарміруецца па алфавіце і нумаруецца, спасылкі па тэксце даюцца ў выглядзе нумароў у квадратных дужках. Малюнкі і інш. графічныя аб’екты – толькі чорна-белыя (с градацыяй шэрага) – абавязкова павінны быць уключаны ў файл артыкула (фармат *.tif, 600 dpi). У артыкуле трэба ўказаць УДК.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбора дакладаў для ўдзелу ў канферэнцыі і артыкулаў для публікацыі. Артыкулы ў папяровым і электронным выглядзе прадстаўляюцца аўтарамі падчас працы канферэнцыі ці дасылаюцца пазней (тэрмін падачы – ***да 1 кастрычніка 2022 г.***).

Аплата праезда, харчавання і пражывання за кошт камандзіруючых арганізацый.

**Адрас аргкамітэта:** 220072 Беларусь, Мінск, вул. Акадэмічная 1
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел антрапалогіі, каб. 213
Тэл.: +375-17-379-27-96, факс: +375-17-379-18-34. E-mail: belantrop@tut.by

Аргкамітэт канферэнцыі